## ФИЛОСОФИЯ

УДК 141.319(476.5-21Полацк) DOI 10.52928/2070-1640-2024-41-1-100-103

# ЦІ БЫЛА ПОЛАЦКАЯ НЕАСХАЛАСТЫКА: ДА ПЫТАННЯ АБ ФІЛАСОФСКАЙ ПРЫНАЛЕЖНАСЦІ

*канд. філас. навук Г.І. КЛІМОВІЧ*
*(Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, Мінск)*
*ORCID https://orcid.org/0000-0001-5555-1190*

*Разглядаецца пытанне прыналежнасці філасофскай традыцыі Полацкай езуіцкай акадэміі ў адносінах да руху неасхаластыкі ў адпаведнасці з мэтай артыкула. З дапамогай метадаў гісторыка-філасофскай рэканструкцыі і кампаратывісцкага аналізу аўтар будуе гістарычныя паралелі паміж асноўнымі элементамі неасхаластычнай філасофіі і праграмнымі ўстаноўкамі інтэлектуальнай спадчыны прадстаўнікоў Полацкай акадэміі. Асноўнымі матэрыяламі даследавання выступаюць акадэмічныя курсы Дж. Анджаліні і В. Бучынскага, а таксама артыкулы "Полацкага штомесячніка". Навуковая навізна даследавання заключаецца ў дакладным вызначэнні філасофскай прыналежнасці комплексу ідэй полацкіх мысліцеляў у адпаведнасці з фармальным і змястоўным крытэрыямі.*

*Ключавыя словы: схаластыка, неасхаластыка, Полацкая езуіцкая акадэмія, гісторыя філасофіі Беларусі, рэлігійная філасофія, філасофія езуітаў, французская Асвета, рацыяналізм, нямецкая класічная філасофія.*

**Уводзіны.** Комплекс філасофскіх ідэй прадстаўнікоў Полацкай езуіцкай акадэміі да гэтага часу з'яўляецца даследаваным недастаткова поўна. У прыватнасці, адкрытым пытаннем застаецца яго сувязь з найбольш уплывовымі напрамкамі рэлігійнай філасофіі XIX стагоддзя. У сваю чаргу гэтая "недаказанасць" прыводзіць да няправільнага вызначэння месца і ролі ідэй прадстаўнікоў акадэміі ў гісторыі філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі Беларусі, а таксама да няправільнай ацэнкі вынікаў іх філасофскай рэфлексіі, скажае магчымасць аб'ектыўнай гістарычнай рэканструкцыі філасофскага ландшафту Полацка як аднаго з найбольш значных культурных цэнтраў беларускай дзяржавы і змяншае культурны ўклад Беларусі ў сусветную інтэлектуальную спадчыну ў цэлым. Усё вышэйсказанае абумоўлівае актуальнасць і неабходнасць звароту да творчасці полацкіх акадэмікаў з мэтай філасофскай ідэнтыфікацыі іх праграмных установак.

Такім чынам, мэтай даследавання з'яўляецца вызначэнне філасофскай прыналежнасці комплексу ідэй прадстаўнікоў Полацкай езуіцкай акадэміі. Дасягненне мэты рэалізуецца праз рэканструкцыю спецыфікі рэфлексіі абраных аўтараў (Дж. Анджаліні, В. Бучынскі, Ф.К. Стахоўскі, Ст. Пятровіч, Я. Ротан, Я. Разавен), вызначэнне асноўных тэм іх інтэлектуальных пошукаў і параўнанне іх з характэрнымі рысамі неасхаластычнай вехі рэлігійнай філасофіі ў самым пачатку яе развіцця – у XIX стагоддзі. Даследаванне заснавана на звароце да работ акадэмічнай філасофіі, артыкулаў у перыядычным друку. Асноўнымі метадамі, якія выкарыстоўваюцца ў даследаванні, з'яўляюцца гісторыка-філасофская рэканструкцыя і кампаратывісцкі аналіз.

**Асноўная частка.** Адным з аўтарытэтных напрамкаў рэлігійнай філасофіі, якія развіваліся на працягу стагоддзяў у тым ліку і ў межах філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі Беларусі, з'яўляецца схаластычная традыцыя. Пры гэтым трэба адзначыць, што само вызначэнне асноўных гістарычных этапаў яе развіцця застаецца ў сучаснасці дастаткова складаным пытаннем, паколькі перыяд яе існавання з XV па XVIII стагоддзі знаходзіўся доўгі час па-за праблемным полем гісторыкаў філасофіі. Папулярнай была думка, што да пачатку XIX стагоддзя схаластыка вычарпала практычна ўвесь творчы патэнцыял і толькі энцыкліка папы рымскага Льва XIII Aeterni Patris стала прыступкай, якая дазволіла рэлігійнай філасофіі каталіцкага кірунку выйсці на новы ўзровень. Досыць вялікая група даследчыкаў схаластычнай традыцыі падтрымлівала і працягвае падтрымліваць гэтую пазіцыю [1, с. 4; 2, с. 159; 3; 4].

Тым не менш з праведзеных даследаванняў [5] відавочна, што Aeterni Patris была толькі афіцыйным замацаваннем новага вітка развіцця схаластычнай традыцыі, у той час як пошук новых падыходаў да сярэднявечнай спадчыны ішоў ужо задоўга да прыняцця энцыклікі.

Разглядаючы ідэі прадстаўнікоў Полацкай езуіцкай акадэміі, варта адзначыць, што першая спроба ідэнтыфікацыі традыцыі дадзенай інтэлектуальнай супольнасці была ажыццёўлена В.Ф. Шалькевічам, які ўвёў тэрмін «полацкая неасхаластыка» [6, с. 524]. Аднак затым на працягу дастаткова доўгага перыяду часу пазначанае сцвярджэнне мела статус гіпатэтычнага. Аўтар у даследаванні ставіць задачай праверыць дадзеную гіпотэзу і затым прыняць яе ці абвергнуць у адпаведнасці як з фармальнымі, так і змястоўнымі крытэрыямі, уласцівымі неасхаластыцы.

У сувязі з гэтым трэба звярнуць увагу на асаблівы літаратурны стыль, характэрны для схаластычных твораў. Яго складнікамі з'яўляюцца зварот да Аб'яўлення і аўтараў класічнай схаластыкі (эпоха Сярэднявечча), рацыянальнасць, выкарыстанне спецыфічнага дыялектычнага падыходу [6]. Указаннем на з'яўленне прыкмет

менавіта неасхаластычнай накіраванасці была, на думку даследчыкаў, адмова ад паўсюднага выкарыстання латыні на карысць нацыянальных моў [1, с. 55]. Яшчэ адна прыкмета, якая ўскосна вызначае менавіта неасхаластычныя ідэйныя комплексы – наяўнасць гістарычных даследаванняў, якія сведчаць аб сталасці традыцыі, яе здольнасці да самарэфлексіі і пераасэнсавання назапашанага культурнага вопыту [1, с. 38]. Але найбольш значнай, на наш погляд, прыкметай праявы сутнасці новага этапу схаластыкі быў зварот да актуальных для XIX стагоддзя філасофскіх тэмаў і персаналій.

Ці быў стыль полацкіх акадэмікаў у сваёй сутнасці схаластычным? На наш погляд, адказ на гэтае пытанне будзе станоўчым. Гэтыя аўтары не толькі звярталіся да праўдаў Аб'яўлення, але і лічылі іх дастаткова аўтарытэтнай крыніцай, на якую варта спасылацца ў тым ліку і ў полі філасофскай аргументацыі. Ужыванне праўдаў Аб’яўлення ў першую чаргу ўласціва акадэмічнаму кірунку творчай спадчыны полацкіх аўтараў – дадзены феномен сустракаецца ў філасофскіх курсах В. Бучынскага, Дж. Анджаліні. Так, Дж. Анджаліні прапануе студэнтам выкарыстоўваць спецыфічны варыянт доказу – доказ ад Аб'яўлення, які, на думку аўтара, павінен быць у адным шэрагу з лагічнымі доказамі [8, с. 145]. Неабходнасць прыняцця на веру такіх доказаў абгрунтоўваецца шляхам тэалагічнай аргументацыі, якая, у сваю чаргу, з'яўляецца абсалютна прымальнай у рамках рэлігійнай філасофіі. Звяртаецца да праўдаў Аб'яўлення і В. Бучынскі ў межах разгляду трансцэндэнтальнай праблематыкі і яе суаднясення з ідэямі прадстаўнікоў дэізму і пантэізму [9, с. 98].

Аўтарам уласціва таксама і прымяненне дыялектычнага метаду. Як і пры разглядзе папярэдняй прыкметы – звароту да праўдаў Аб'яўлення – дыялектычны метад у абсалютнай большасці выпадкаў прысутнічае ў творах акадэмічнай філасофіі прадстаўнікоў Полацкай акадэміі. Гэта звязана з тым, што для Полацкага штомесячніка ў асноўным выбар тэм быў абмежаваны маральна-філасофскай праблематыкай. У акадэмічным жа напрамку студэнты павінны былі пазнаёміцца з усёй архітэктонікай логікі, якая падтрымлівае схаластычную сістэму.

Аналізуючы сам дыялектычны метад, варта адзначыць, што ў падставе яго ляжаць асноватворныя фігуры сілагізму (Barbara, Cesarii, Darapti, Bramantip), якія выкарыстоўваюцца тут для стварэння магчымасці дыялогу. Для традыцыйнай формы схаластычнай дыялектыкі характэрна спецыфічная лагічная схема, якая ўяўляе сабой сукупнасць наступных элементаў: першы – гэта артыкуляцыя якога-небудзь сцвярджэння, другі быў злучаны з аргументацыяй у падтрымку і супраць разгляданага сцвярджэння, трэці элемент быў адказны за выснову і фармаваўся ў традыцыйнай для схаластычных трактатаў форме "Я кажу".

Пры звароце да акадэмічных курсаў Полацкай акадэміі, як ужо было адзначана вышэй, таксама магчыма прасачыць выкарыстанне дыялектычнага метаду. У «Пачатках філасофіі» В. Бучынскага, у часткі, прысвечанай метафізіцы, ёсць раздзел пад назвай «Аб прынцыпах доказу», у цэнтры якога знаходзіцца канцэпт дастатковай падставы. В. Бучынскі выкарыстоўвае тут раней апісаную схему: спачатку аўтар дае вызначэнне паняцця прынцыпу, затым пераходзіць ужо непасрэдна да прынцыпу дастатковай падставы, пасля звяртаецца да аргументаў, якія высоўваюцца яго ідэйнымі апанентамі – Вольфам і Лейбніцам, далей ідзе абвяржэнне і выснова [9, с. 13–18].

Гэтая ж структура аргументацыі прысутнічае і ў курсе філасофіі Дж. Анджаліні. У якасці прыкладу можна звярнуцца да першай часткі яго працы – логікі, дзе аўтар задаецца пытаннем: што такое ісціна і якімі з'яўляюцца яе крытэрыі. Асаблівая важнасць у межах пазначнай тэматыкі надаецца канцэпту разумовай відавочнасці, які прадстаўляў па сутнасці важную частку схаластычнай традыцыі, паколькі менавіта з ім была звязана магчымасць доказу многіх аб'ектаў метафізічнай тэматыкі. Як і ў папярэднім выпадку, першапачаткова аўтар вызначае само паняцце разумовай відавочнасці, а таксама яго складнікі. Далей ён вызначае крытэрыі разглядаемага паняцця і прыводзіць пярэчанні супраць дадзеных крытэрыяў. У прыватнасці, гэта сцвярджэнне аб тым, што чалавечаму розуму наогул уласціва памыляцца, такім чынам, і разумовая відавочнасць, якая з'яўляецца яго вынікам, таксама можа змяшчаць памылкі. Далей у якасці пярэчання прыводзіцца ідэя аб абмежаванасці магчымасцяў пазнання чалавечага розуму. Апошнім ідзе аргумент ад эмпірыкаў, якія абмяжоўвалі вобласць спазнання толькі пачуццёвым аспектам. Затым ідзе контраргументацыя і выснова аб неабходным існаванні разумовай відавочнасці [1, с. 88–98].

Разам з тым трэба адзначыць, што пазначаныя вышэй характарыстыкі толькі дазваляюць аднесці творчасць полацкіх акадэмікаў да схаластычнага кірунку ў цэлым, але зусім не даказваюць наяўнасці тут менавіта неасхаластычных элементаў. Пошук уласцівасцяў, якія дазваляюць аргументавана сцвярджаць існаванне традыцыі полацкай неасхсаластыкі, прадстаўлены аўтарам ніжэй.

У першую чаргу сведчаннем прыналежнасці менавіта да кірунку асучасненай схаластычнай традыцыі з'яўляецца адыход ад лацінскай мовы і выкарыстанне нацыянальных моў. Такое адхіленне было звязана ў большай ступені з працэсамі фармавання нацый. У гэтых адносінах творчасць полацкіх аўтараў трэба ахарактарызаваць як пераходны этап. Падчас працы са студэнтамі яны заставаліся вернымі ўніверсітэцкай традыцыі мінулых стагоддзяў і аддавалі перавагу выкарыстанню латыні. Аднак пры напісанні артыкулаў для шырокай публікі, будучы паліглотамі, звярталіся да досыць вялікай колькасці моў, у тым ліку рускай, французскай і польскай. З іншага боку, даследчыкі, якія падкрэсліваюць выкарыстанне нацыянальных моў як неад'емную рысу неасхаластыкі, адносяць яе ўзнікненне да 60–70 гг. XIX стагоддзя, таму гэты крытэрый можа ўжывацца адносна прадстаўнікоў Полацкай акадэміі толькі ўмоўна, адрозненне ў часовым прамежку ў цэлым тлумачыць названую вышэй рысу «пераходнасці».

Другой прыкметай, якая вызначае неасхаластычны стыль мыслення, з'яўляецца зварот да гісторыі. Феномен гістарычных даследаванняў, якія закранаюць як ідэі тэолагаў мінулага [10], так і гісторыю царквы [11], роўна як

і спробы пабудовы першых метадалогій гістарычных даследаванняў, дастаткова шырока прадстаўлены ў творчасці дзеячоў Полацкай акадэміі. Адна з магістральных тэм, якая распрацоўваецца аўтарамі ў рамках пазначанай праблематыкі, – гэта карэляцыя гістарычных і тэалагічных доказаў праз прызму параўнання аўтарытэту чалавечага сведчання і праўдаў Аб'яўлення. Да шэрагу такіх работ адносіцца, напрыклад, артыкул Ф.К. Стахоўскага «Разгляд працы Ст. Сакалоўскага Partitiones ecclesiasticae» [12]. Яшчэ адным прыкладам гістарычных даследаванняў з'яўляецца артыкул Яна Разавена «Герадот і Дыядор Сіцылійскі: ці варта ім верыць у пытанні егіпецкай манархіі і ці з'яўляецца іх аўтарытэт вышэйшым за аўтарытэт Майсея, калі бачым мы ў ім толькі летапісца, а не пісьменніка, натхнёнага Богам: адказ на артыкул «Кароткі погляд Егіпта» з Львоўскага штомесячніка» [13]. Сюды ж адносіццаі артыкул Я. Ротана «Нататка з нагоды нататкі пра стогадовых людзей, змешчаная на старонках Рускага інваліда» [14].

Адным з галоўных крытэрыяў, якія сведчаць пра актуальнасць рэфлексіі полацкіх аўтараў у кантэксце разглядаемай эпохі, была іх рэакцыя на тагачасныя інтэлектуальныя выклікі. Для полацкіх мысліцеляў яны ўвасобіліся ў напружаным дыялогу з прадстаўнікамі французскай і нямецкай ліній філасофіі.

Інтэлектуальная рэвалюцыя эпохі Асветы, якая абвясціла пануючымі прынцыпамі філасофіі рацыяналізм і звязаны з ім аўтаномны розум, а затым паспрабавала распаўсюдзіць іх на ўсе бакі жыцця грамадства, не магла застацца па-за межамі рэфлексіі полацкіх акадэмікаў. Зварот да філасофіі французскай Асветы – гэта не толькі крытыка комплексу ідэй атэістычнага кірунку, які пагражае рэлігійнай традыцыі. Найперш гэта спроба пераадолець інтэлектуальную і экзістэнцыйную катастрофу, якую бачылі полацкія аўтары ў Французскай рэвалюцыі. Нездарма асноўнай тэмай артыкулаў Полацкага штомесячніка пры звароце да французскіх філосафаў з'яўляецца ідэя перамір'я рэлігіі і філасофіі, а таксама абмеркаванне магчымасці вяртання галоўнай пазіцыі рэлігійнай дагматыкі. Прыкладам дадзенага феномену служаць артыкулы «Ці можна тэолагаў абвінавачваць у тым, што яны паўсталі супраць філасофіі васемнаццатага стагоддзя?» [15], «Перамір'е паміж сучаснай філасофіяй і рэлігіяй» [16].

Рэакцыя на нямецкую філасофію ў асноўным прадстаўлена ў рамках акадэмічных курсаў. Такое абмежаванне звязана з меркаваннем полацкіх філосафаў аб адсутнасці цікавасці да нямецкай філасофіі сярод шырокай публікі [17, с. 7].

Крытыка работ Канта ў Полацкай езуіцкай акадэміі з'яўляецца часткай больш шырокага руху каталіцкай філасофіі. У полацкім выпадку яна збольшага была рэалізавана ў класічных курсах філасофіі Дж. Анджаліні і В. Бучынскага. Заснавана яна была на тых жа праграмных устаноўках, якія ў далейшым будуць пакладзены ў падмурак неатамістычнай філасофіі. Калі Дж. Анджаліні ў асноўным канцэнтраваўся на асобных праблемах кантаўскай філасофіі [18, с. 116–125], то ў творчасці В. Бучынскага крытыка ідэй Канта носіць сістэмны характар, ідзе па ўзыходзячай ад логікі [19, с. 20] да маральнай філасофіі [20, с. 32] і філасофіі права [20, с. 94]. Філасофію Канта, паводле Бучынскага, трэба адносіць да так званага «перыяду замяшання», які пачынаецца рэфармацыяй і заканчваецца якраз афармленнем ідэй філасофіі Канта. Асноўнымі пастулатамі, з якімі не можа пагадзіцца В. Бучынскі, з'яўляюцца адмаўленне існавання, на думку аўтара, у кантаўскай філасофіі аб'ектыўнай рэальнасці, немагчымасці спасціжэння аб'ектыўнай ісціны, што, у сваю чаргу, з'яўляецца прамым шляхам да скептыцызму. Не ўспрынялі полацкія аўтары і вучэнне Канта аб прасторы і часе як апрыёрных формах. Але самым вялікім каменем спатыкнення, які выклікаў незадавальненне полацкіх неасхаластаў, была крытыка Кантам доказаў існавання Бога, на яе і быў вымушаны адказваць В. Бучынскі ў сваёй метафізіцы. Галоўнымі філасофскімі аўтарытэтамі, на якія абапіраецца В. Бучынскі, з'яўляюцца філосаф-езуіт, прафесар Інсбруцкага ўніверсітэта Якуб Цалінгер, а таксама Пётр Міёці – вядомы родапачынальнік антыкантыянскай лініі рэлігійнай філасофіі.

**Заключэнне.** Такім чынам, на аснове прыведзеных вышэй аргументаў даказаны факт, што па сваёй форме і зместу філасофская спадчына прадстаўнікоў Полацкай езуіцкай акадэміі сапраўды належыць да неасхаластыкі. У сваю чаргу гэта прыводзіць да змены разумення гістарычнай панарамы і філасофскага ландшафту як Беларусі, так і Расійскай імперыі, роўна як і Заходняй Еўропы. Калі філасофія полацкіх акадэмікаў сапраўды з'яўляецца неасхаластычнай па сваёй сутнасці, то сам пачатак гістарычнага існавання неасхаластыкі варта аднесці не да сярэдзіны XIX стагоддзя, як сцвярджалася раней, а да яго пачатку, а першым яго цэнтрам будзе не Фрыбург або Лувен, а беларускі горад, які знаходзіўся ў гэты час у межах Расійскай імперыі, – Полацк.

ЛІТАРАТУРА


1. Perrier J.L. The revival of scholastic philosophy in the nineteenth century. – New York. – 1909. – 354 p.
2. Wulf M. Scholasticism old and new: an introduction to scholastic philosophy medieval and modern. – Dublin. – 1907. – 328 p.
3. Кимелев Ю.А. Неосхоластика и схоластическая философия // Социальные и гуманитарные науки. Отечественная и зарубежная литература. Сер. 3. Философия. – 2023. – № 3. – С. 104–123. DOI: 10131249/rphil/2023.03.07
4. Арапов А.В. Неосхоластика: история и основные концепции // Вестн. ВГУ. Сер.: философия. – 2015. – № 3. – С. 51–58.
5. Клімовіч Г.І. Інварыянты назваў у схаластычная традыцыі // Науч. тр. Республик. ин-та высш. шк. – № 2. – 2021. – С. 27–32.
6. Шалькевіч В.Ф. Полацкая неасхаластыка // Мировоззренческие и философско-методологические основания развития современного общества: Беларусь, регион, мир: материалы междунар. науч. конф. / Минск (5–6 нояб. 2008 г.) / под ред. Т.А. Адуло. – Минск, 2008. – С. 524–525.
7. List of books in the Neo-scholastic tradition [Electronic resource] – URL: https://catholicebooks.wordpress.com/2013/03/07/list-of-ebooks-in-the-neoscholastic-manualist-tradition/ (дата обращения: 2019-02-19).
8. Angiolini G. Instutiones Philosophicae ad usum studiosorum Academiae Polocensis. – Polock. – 1819. – 310 p.

9. Buczyński V. Instutiones philosophicae, pars secunda continens metaphisicam. – Viennae, 1844. – 302 p.
10. Stachowski F.K. Listy Filipa Padniewskiego krakowskiego biskupa pisane do Zygmunta Augusta króla polskiego, wyjęte z rękopisu znajdującego się w bibliotece Akademii Połockiej // Miesięcznik Połocki. – 1818. – T. 1. – № 3. – S. 217–221.
11. Snarski K. Uwagi o Templariuszach z powodu umieszczonej o nich historycznej wiadomości przed tragedią graną na teatrze a Warszawie d.13 kwietnia 1819 roku // Miesięcznik Połocki. – 1820. – T. 4. – № 2. – S. 79–110.
12. Stachowski F.K. Rozbiór dziełka Stanisława Sokołowskiego pod napisem Partitiones Ecclesiasticae // Miesięcznik Połocki. – 1818. – T. 1. – № 1. – S. 43–53.
13. Rozaven J. Herodot i Diodor Sycylijski czy są godni wiary w tym co mówią o dawności monarchii egipskiej; i czy ich powaga większa jest od Mojżesza, jeśli w tym prawodawcy Żydów uważać zechcemy tylko dziejopisa, nie zaś pisarza natchnionego od Boga. Rozprawa napisana z powodu artykułu: Rzut oka na Egipt, umieszczonego w „Pamiętniku Lwowskim” // Miesięcznik Połocki. – 1818. – T. 2. – № 8. – S. 219–255.
14. Roothaan J.F. Uwagi nad uwagami o ludziach stuletnich, umieszczonymi w nrze 123 Ruskiego Inwalida // Miesięcznik Połocki. – 1818. – T. 3. – № 11. – S. 153–171.
15. Czarnocki F.K. Czy można teologów słusznie obwiniać, że na filozofię 18go wieku powstają? // Miesięcznik Połocki. – 1820. – T. 4. – № 1. – S. 44–57.
16. Przymierze między dzisiejszą filozofią i religią // Miesięcznik Połocki. – 1818. – T. 1. – № 1. – S. 58–62.
17. Przemowa // Miesięcznik Połocki. – 1818. – T. 1. – № 1. – S. 1–7.
18. Климович А.И. Анджолини VS Кант: к философскому наследию Полоцкой иезуитской академии // Кантовский сборник. – 2023. – Т. 42. – № 1. – С. 107–131. DOI: 10.5922/0207-6918-2023-1-6
19. Buczyński V. Instutiones philosophicae, pars secunda continens logicam cum praevia in universam philosophiam intrudictione. – Viennae, 1843. – 159 p.
20. Buczyński V. Instutiones philosophicae, pars tertia continens ethicam. – Viennae, 1844. – 206 p.


*Поступила 22.03.2024*

## WAS THERE POLOTSK NEOSCHOLASTICISM: ON THE QUESTION OF PHILOSOPHICAL AFFILIATION

***H. KLIMOVICH***
***(Belarusian State Medical University, Minsk)***

*The question of belonging the philosophical tradition of the Polotsk Jesuit Academy in relation to the Neo-Scholastic movement is considered. Using the methods of historical-philosophical reconstruction and comparative analysis, the author builds historical parallels between the main elements of Neo-Scholastic philosophy and the program settings of the intellectual heritage of Polotsk Academy representatives. The main research materials are the academic courses of J. Angiolini and V. Buczyński, as well as articles from the “Miesięcznik Połocki”. The scientific novelty of the research lies in the precise definition of the philosophical affiliation of the complex of ideas, which belongs to Polotsk thinkers in accordance with formal and substantive criteria.*

***Keywords:*** *scholasticism, Neo-Scholasticism, Polotsk Jesuit Academy, history of Belarusian philosophy, religious philosophy, Jesuit philosophy, French Enlightenment, rationalism, German classical philosophy.*

## БЫЛА ЛИ ПОЛОЦКАЯ НЕОСХОЛАСТИКА: К ВОПРОСУ О ФИЛОСОФСКОЙ ПРИНАДЛЕЖНОСТИ

***Г.И. КЛИМОВИЧ***
***(Белорусский государственный медицинский университет, Минск)***

*Рассматривается вопрос принадлежности философской традиции Полоцкой иезуитской академии к движению неосхоластики. С помощью методов историко-философской реконструкции и компаративистского анализа автор строит исторические параллели между основными элементами неосхоластической философии и программными установками интеллектуального наследия представителей Полоцкой академии. Основными материалами исследования выступают академические курсы Дж. Анджолини и В. Бучинского, а также статьи «Полоцкого ежемесячника». Научная новизна исследования заключается в точном определении философской принадлежности комплекса идей полоцких мыслителей в соответствии с формальным и содержательным критериями.*

***Ключевые слова:*** *схоластика, неосхоластика, Полоцкая иезуитская академия, история философии Беларуси, религиозная философия, философия иезуитов, французское Просвещение, рационализм, немецкая классическая философия.*